ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
5
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 17 (1393)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
**тэлетайп**
• Учора • Сёння • Заўтра •

### МАСАВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

па спартыўнаму арыентаванню пад дэвізам «Усёй групай — на старт!» прайшлі на факультэце прыкладной матэматыкі. У іх удзельнічала больш за 500 студэнтаў 1, 2 і 3 курсаў. Перамагла другая група першага курса, якая прадэманстравала трывалыя веды па тапаграфіі і добры спартыўны настрой.

**А. МІХНАВЕЦ,**
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

### З ЦІКАВЫМ РЭПЕРТУАРАМ

выступіў танцавальны ансамбль «Крыжачок» на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе народных калектываў. Гэтым ён пацвердзіў званне «народнага».

**У. МАКАРЭВІЧ,**
дырэктар студэнцкага клуба.

### АБ РАБОЦЕ ПРАФБЮРО

прыродазнаўчых факультэтаў па развіццю палітычнай актыўнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў вялася размова на чарговым пасяджэнні прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў універсітэта. З дакладам выступіў дацэнт кафедры гісторыі КПСС П. І. Зялінскі.

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

### 18-Й ГАДАВІНЕ

Народнага фронту вызвалення Палесціны (Генеральнага камандавання) быў прысвечаны вечар, які прайшоў у актавай зале універсітэта.

**АЛЬ-АГРАМІ МУСТАФА,**
член інтэрпрэс-цэнтра.

### ПРАЙШОЎ

традыцыйны агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Цікавай і змястоўнай была канцэртная праграма фізічнага факультэта. Нядрэнна выступілі і прадстаўнікі кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў.

**Э. АНІСЕНКА,**
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

## ІМЁНЫ НА МАРМУРЫ

НАПЯРЭДАДНІ 9 МАЯ на юрыдычным факультэце адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны Дню Перамогі і занясенню новых імёнаў на мемарыяльную дошку «Светлай памяці выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў Мінскага юрыдычнага інстытута, загінуўшых у барацьбе з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Мы сабраліся каля святога месца, каб парадавацца вялікай Перамозе і ўшанаваць памяць тых, хто за гэтую Перамогу аддаў сваё жыццё, чые імёны напісаны золатам на белым мармуры.

Сярод іх імёны Васіля Жудро—студэнта 2-га курса, члена Мінскага падпольнага гаркома КПБ, выкладчыка Мікалая Канстанцінавіча Каржанеўскага, былога сакратара Кастрычніцкага падпольнага райкома КПБ Мінска, які пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на розных франтах загінулі: студэнт 4-га курса радавы Лаўрэнцій Мітрафанаў, студэнт 2-га курса гвардыі старшы сяржант Аляксей Фралоў, студэнт 3-га курса старшы лейтэнант Мікалай Пікуль, выкладчык маёр Гіры Гейфман і іншыя.

Большасць выкладчыкаў і студэнтаў Мінскага юрыдычнага інстытута змагаліся з ворагам у падполлі і ў партызанскіх атрадах.

Многія з іх загінулі. На мемарыяльнай дошцы імёны М. Ф. Малаковіч і А. А. Сокалавай. Марыя Федасееўна была выкладчыцай гісторыі, членам групы выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага інстытута, якая, як сведчаць дакументы і матэрыялы, узнікла ў ліку першых у горадзе. Потым М. Ф. Малаковіч—кіраўнік камуністычнага падполля ў Калодзішчах. Антаніна Аляксееўна Сокалава выкладала крымінальны працэс, а калі пачалася вайна, з першых дзён уключылася ў барацьбу з ворагам. Актыўным удзельнікам камуністычнага падполля ў Магілёве, а затым партызанам быў Дзмітрый Рэпін—студэнт 4-га курса, сакратар камітэта камсамола інстытута. У адным з баёў яго акружылі карнікі. Але Дзмітрый не здаўся ў палон. Ён узарваў гранатай сябе і ворагаў.

Першыя імёны (13 чалавек) былі напісаны на мармуровай дошцы напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Пошук працягваўся: да 60-годдзя БССР з невядомасці былі вырваны пяць новых імёнаў, а да Дня Перамогі 1981 года — яшчэ пяць.

Сёлета ў дзень мітынгу выкладчыкі і студэнты прачыталі новыя імёны загінуўшых.

Надзежда Акуліч была студэнткай 4-га курса. Надзя пачала здаваць дзяржаўныя экзамены, але здаць да канца не паспела: пачалася вайна, і яна стала партызанскай сувязной. Потым была схоплена гестапаўцамі і ў жніўні 1942 года расстраляна ў Слуцку.

Студэнт другога курса Фёдар Максімаў, маючы фізічны недахоп, не меў магчымасці быць у арміі. Але ён знайшоў сваю перадавую. У роднай вёсцы Казімірава Полацкага раёна Віцебскай вобласці ён стварыў падпольную камсамольскую групу, якая 20 мая 1942 года злілася з партызанскім атрадам. Фёдар стаў кулямётчыкам. У час бою з карнікамі ён загінуў.

Пошук працягваецца. На адным толькі 4-м курсе перадваеннага навучальнага года было 60 студэнтаў. 21 з іх загінуў. Кожны трэці! А на мемарыяле толькі 9 імёнаў чацвёртакурснікаў. Мы памятаем дэвіз: «Ніхто не забыты, нішто не забыта!».

Ёсць чым ганарыцца выкладчыкам і студэнтам юрыдычнага факультэта і ўсяго універсітэта. Імёнамі Васіля Жудро і Мікалая Каржанеўскага названы вуліцы ў Мінску. Імёнамі, занесенымі на мемарыяльную дошку, студэнты называюць свае будаўнічыя атрады. Яны сталі блізкія нам. Мы з асаблівай цеплынёй успамінаем іх у дні народных свят, перапісваемся з іх сябрамі і роднымі. Гэта вучыць юнакоў і дзяўчат — сённяшніх студэнтаў—цаніць мір, мацаваць дружбу.

**І. ГАРЭЛІК,**
**прафесар, кіраўнік групы «Пошук» юрыдычнага факультэта.**







ВІНШУЕМ КАРЭСПАНДЭНЦКІ АКТЫЎ З ДНЁМ ДРУКУ. ВЫКАЗВАЕМ УПЭЎНЕНАСЦЬ НА ДАЛЕЙШАЕ ПЛЁННАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА.

## МЫ ЗАХАВАЕМ МІР

— ВОСЬ ТУТ БЫЎ МОЙ ДОМ, — працягваў свой расказ Віктар Андрэевіч Жалабковіч, — тут штодня я гуляў з братам і сястрой.

Віктар Андрэевіч на хвіліну замоўк, прыпамінаючы мінулае. Я і Зайнаб Салама, студэнтка з Палесціны, таксама маўчалі. Толькі званы спявалі жалобную песню спаленай вёсцы.

Хатынь... Гады аддаляюць нас ад таго дня, калі разыгралася тут страшная трагедыя.

Мы стаялі каля Вечнага агню, што палае ў знак памяці аб загінуўшых. І ў гэтым полымі бачыўся мне той пажар, які ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі на беларускай зямлі. Жудасна рабілася ад думкі, што лёс Хатыні — не адзіны прыклад зверстваў ворагаў Краіны Саветаў у час другой сусветнай вайны. 186 вёсак знішчылі карнікі толькі на тэрыторыі Беларусі. Але не ўдалося ворагам скарыць савецкі народ, перамагчы яго.

Неацэннае значэнне мае імкненне ўсіх савецкіх людзей да раззбраення, да ўмацавання міру. Народ, які перажыў усе жахі вайны, ніколі больш не дапусціць, каб яна паўтарылася. І няхай дзеячы агрэсіўных імперыялістычных колаў лезуць са скуры, каб здзейсніць свае злачынныя задумы, — добрая воля ўсіх людзей нашай планеты не дазволіць разгарэцца новаму пажару вайны.

— Хатынь напамінае мне аб лёсе нашай палесцінскай вёскі Дэр-Ясін, вашай в'етнамскай Сангмі,— звярнулася да мяне Зайнаб Салама, калі мы, пад журботны перазвон званоў, пакідалі беларускую вёску, якая стала помнікам ахвярам фашызму.

**КІРЫМ ЦЬЕН ХАЙ,**
**студэнт журфака.**



## НАПЯРЭДАДНІ СВЯТА

ПРАЗ НЕКАЛЬКІ дзён мы будзем святкаваць Дзень Перамогі. Гэтай знамянальнай даце прысвячаюцца шматлікія мерапрыемствы, што праводзяцца ва універсітэце. На гістарычным факультэце прайшла канферэнцыя па кнізе тройчы Героя Савецкага Саюза, Маршала Савецкага Саюза Сямёна Міхайлавіча Будзённага «Пройденный путь». З уступным словам выступіў дацэнт кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму Л. А. Міхайлоўскі, які спыніўся на біяграфіі вядомага дзеяча Савецкай дзяржавы, на дзейнасці С. М. Будзённага па стварэнню 1-й Коннай арміі. Вялікія заслугі С. М. Будзённага і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аб гэтым расказалі студэнты С. Вечар, А. Бужак, І. Зуб. З асаблівай цікавасцю слухалі прысутныя ўспаміны ўдзельніка грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў генерал-лейтэнанта танкавых войск С. С. Сергіенкі, які шэсць разоў сустракаўся з Будзённым.

З удзелам супрацоўнікаў абанемента вучэбнай літаратуры былі арганізаваны таксама дыспуты па кнігах А. Бека «Волоколамское шоссе», К. Сіманава «Дни и ночи», Ю. Бондарава «Горячий снег», В. Быкава «Дажыць да світання» і іншых.

**А. РУКШЫН,**
**загадчык аддзела вучэбнай літаратуры.**

● ТРЫБУНА ПАРТОРГА

## ВЫХАВАННЕ ПРАЦАЙ

ПЫТАННЯМ ПРАЦОЎНАГА выхавання студэнтаў партбюро факультэта радыёфізікі і электронікі ўдзяляе вялікую ўвагу. Выхаванне працай спрыяе абуджэнню арганізацыйных здольнасцей, самастойнасці, ініцыятывы, тых якасцей, якія спатрэбяцца будучым спецыялістам-радыёфізікам у іх практычнай дзейнасці.

Працоўнае выхаванне студэнтаў нашага факультэта ажыццяўляецца перш за ўсё ў студэнцкіх будаўнічых атрадах і на сельгасработах. У СБА студэнты вучацца не толькі працаваць, але і жыць па-камуністычнаму, кожны з іх адчувае сваю прыналежнасць да грандыёзных спраў нашай краіны.

У мінулым годзе на факультэце было арганізавана 10 СБА, у якіх прынялі ўдзел 292 студэнты. Было выканана работ на суму звыш 1 млн. 300 тыс. рублёў. Узорам высокай свядомасці стала праца студэнтаў камуністычнага атрада, які асвоіў 58 тыс. рублёў на будаўніцтве школы і заняў першае месца ў Мінскай гарадской зоне СБА. Нашымі будатрадаўцамі за «дні ўдарнай працы» было пералічана 8 тыс. рублёў, а ў Фонд міру—7,5 тыс. рублёў. Па выніках працоўнага семестра 7 будатрадаўцаў былі ўзнагароджаны граматамі рэктарата, а 5 — граматамі Якуцкага абкома камсамола.

Адначасова байцы СБА праводзяць і вялікую агітацыйную работу, выступаюць з лекцыямі, канцэртамі, спаборнічаюць з атрадамі іншых ВНУ. На працягу працоўнага семестра студэнты прачыталі 209 лекцый, далі больш за 100 канцэртаў.

У гэтым годзе на факультэце сфарміравана 12 СБА, у якіх па плану прымуць удзел 352 студэнты. 11 атрадаў з'яўляюцца будаўнічымі, адзін — небудаўнічы. Гэты атрад будзе працаваць на ўборцы ўраджаю у Малдавіі. Месца дыслакацыі астатніх СБА — Якуція, Алтайскі край, Цюменская вобласць, Карэлія, Пскоўская, Віцебская, Мінская вобласці і горад Мінск. Як і ў мінулым годзе, будзе адзін камуністычны атрад.

Ва ўсіх атрадах прайшлі сходы, на якіх байцы азнаёміліся з Палажэннем аб СБА і Статутам СБА, прынялі планы работы на падрыхтоўчы перыяд, сацыялістычныя абавязацельствы. Байцамі СБА ўжо прачытана больш як 50 лекцый па тэматыцы, падрыхтаванай выкладчыкамі грамадскіх дысцыплін, праведзена 17 суботнікаў.

Такім чынам, можна сказаць, што падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра на факультэце радыёфізікі і электронікі ідзе па плану, і можна спадзявацца, што вынікі працы будатрадаўцаў будуць нядрэннымі.

Значны ўклад у выкананне Харчовай праграмы ўносяць студэнты нашага факультэта ў час работы ў сельгасатрадах. Вось ужо некалькі гадоў запар яны працуюць у саўгасах і калгасах Магілёўскай вобласці. У мінулым годзе імі быў выканаиы даволі значны аб'ём работ, аднак вынікі маглі быць лепшымі, калі б не недахопы ў арганізацыі сельгасработ з боку прымаючых арганізацый. Нягледзячы на тое, што нашы студэнты апошнія тры гады працуюць у адных і тых жа гаспадарках, многія пытанні, якія датычацца быту і адпачынку, не вырашаны да гэтай пары. Неабходна звярнуць сур'ёзную ўвагу занальнага штаба на недахопы, ліквідацыя якіх дапаможа нашым студэнтам працаваць у поўную сілу.

**Л. КІРЫЛА,**
**сакратар партбюро факультэта радыёфізікі і электронікі.**

## ...І АДКРЫЕЦЦА СТАРАЖЫТНАЯ РУСЬ

**Каштоўныя знаходкі, унікальныя прадметы, знойдзеныя ў час летніх раскопак, вывучаюцца зараз студэнтамі і выкладчыкамі гістарычнага факультэта. Каштоўныя яшчэ і таму, што знойдзены яны самімі студэнтамі ў час апошняй археалагічнай практыкі.**

У ТАКІЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ першакурснікі факультэта ездзяць штогод. Работы гэтыя па-свойму рамантычныя і нечаканыя: здымаецца знешняе земляное покрыва, і на месцах, здавалася б, нічым раней не знамянальных, адкрываюцца раптам помнікі Старажытнай Русі.

Шмат цікавага тоіць у сабе зямля Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Нямала курганоў эпохі Старажытнай Русі XII—XIII стагоддзяў захавалася на тэрыторыі вёскі Заполле. А ў вёсцы Вішчын вось ужо шосты год студэнтамі-гісторыкамі праводзяцца работы па раскопках унікальнага феадальнага замка, які адносіцца таксама да XII—XIII стагоддзяў.

Раскопкі старажытнага Мінска вядуцца студэнтамі гістарычнага факультэта вось ужо больш за дваццаць гадоў. Асабліва цікавяць археолагаў рэшткі Мінскага крамля, заходняя частка якога даследуецца сёння. Шматлікія рэшткі драўляных дамоў, насцілаў, мноства шкляных бранзалетаў — прыкметы гарадской феадальнай культуры — знойдзены студэнтамі ў мінулым годзе.

Работы ў вёсцы Вішчын заслугоўваюць асаблівай увагі. Замак, які знаходзіцца на яе тэрыторыі, надзвычай цікавы як археалагічны аб'ект. Звычайна, калі справа датычыцца раскопак старажытных пабудоў, то маюцца на ўвазе толькі курганы і рэшткі гарадскіх дамоў. Замкаў жа гэтага часу амаль не захавалася.

Прыблізна ў сярэдзіне XIII стагоддзя ён быў пакінуты сваімі жыхарамі. І па сутнасці на працягу васьмі стагоддзяў заставаўся некранутым. Гэта значыць да таго самага часу, пакуль не быў знойдзены студэнтамі універсітэта. Замак у вёсцы Вішчын — гэта сапраўды нікім не кранутая скарбонка Старажытнай Русі. У добрым стане знаходзяцца рэшткі яго ўмацаванняў. Замак раскопваецца і даследуецца выключна студэнтамі-гісторыкамі. У будучым плануецца раскрыць яго цалкам, а тое, што ўжо зроблена, — прыблізна трэцяя частка ўсіх работ.

Кожны год пры такіх работах студэнты знаходзяць і мноства асобных прадметаў, якія характарызуюць быт і заняткі жыхароў. У 1979 годзе быў выяўлены унікальны клад: шматлікія жаночыя ўпрыгожанні, выраблёныя з серабра і золата, сярэбраныя зліткі. Падобныя ўпрыгожанні былі знойдзены і ў 1982 годзе. Але найбольш цікавай знаходкай стаў, як лічаць археолагі, каменны грузік-праслачка, які надзяваўся на верацяно. На яго паверхні прарэзаны надпіс, які ўяўляе сабой пяць першых літар рускага алфавіта. Падобныя праслічкі знаходзілі і раней, але кожны раз на іх былі высечаны рускія імёны, асобныя словы, а такія «упрыгожанні» сустрэліся ўпершыню.

Цікавыя і такія знаходкі, як абрывак старажытнай жалезнай кальчугі, якая належала хутчэй за ўсё воіну эпохі Кіеўскай Русі, шэраг прадметаў быту: нажы, коп'і, наканечнікі, мноства шкляных бранзалетаў. Знойдзены і шматлікія абломкі амфар — пасудзін для захоўвання віна, якія прывозілі ў Старажытную Русь. Яны сведчаць аб сувязях нашых продкаў з другімі народамі.

Усе гэтыя рэчы дазваляюць нам больш падрабязна даведацца пра жыццё, заняткі і быт нашых продкаў, ацаніць іх майстэрства. А студэнтам-гісторыкам, якія здабываюць з тоўшчы вякоў прадметы матэрыяльнай культуры, — праверыць на практыцы свае тэарэтычныя веды, набыць неабходныя практычныя навыкі, яшчэ больш палюбіць сваю прафесію.

**Т. РУМЯНЦАВА.**



*Я ЗНАЙШОЎ АЛЕНУ БАРОЎСКУЮ ў лабараторыі, хаця ў гэты дзень у пяцікурснікаў па раскладу заняткаў не было. Ужо трэці год яна на кафедры біяхіміі і пастаянна працуе над адной тэмай. Член рэдкалегіі факультэцкай насценгазеты. Пераможца другога тура Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і НТП», удзельніца трэцяга тура, які праходзіў у Кішынёве.* Фота **В. Шачака.**

# З КЛОПАТАМ АБ ДЗЕЦЯХ

**Пара мацярынства, яна самая шчаслівая для кожнай жанчыны. Шчаслівая і цяжкая. Для студэнтаў, якія ўжо маюць дзяцей, і для будучых бацькоў мы падрыхтавалі інтэрв'ю старшыні студэнцкага прафсаюзнага камітэта Мікалая Мінавіча ДРАЗДА.**

— **Мікалай Мінавіч, якая дзяржаўная дапамога аказваецца студэнтам-бацькам вышэйшых навучальных устаноў пры нараджэнні дзіцяці?**

— Студэнтам, якія вучацца на стацыянары, выплачваецца за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання дапамога ў размеры пяцідзесяці рублёў пры нараджэнні першага дзіцяці. Пры нараджэнні другога ці трэцяга — сто рублёў. У тых выпадках, калі маці не працуе і не вучыцца, дапамога выплачваецца ў размеры трыццаці рублёў пры нараджэнні першага, другога і трэцяга дзіцяці, але ўжо бацьку, які вучыцца, незалежна ад атрымліваемай ім стыпендыі. А калі ў вас паявіцца двойня або нават тройня, дык дапамога на кожнага з дзяцей выплачваецца такая ж, як і пры нараджэнні другога і трэцяга. Дакументы на афармленне адпаведнай дапамогі прадстаўляюцца ў прафком універсітэта.

— **Ці выдзяляецца студэнтам дапамога па догляду за дзіцем да дасягнення ім узросту аднаго года?**

— Вядома, такая дапамога маці аказваецца. У БССР яна выплачваецца ў размеры 35 рублёў у месяц, пачынаючы з 1 лістапада 1982 года.

— **У якім размеры выплачваецца дзяржаўная дапамога адзінокім маці?**

— Адзінокім маці выплачваецца дапамога ў размеры 20 рублёў у месяц на кожнае дзіця, пачынаючы са снежня 1981 года ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 22 студзеня 1981 года «Аб мерах па ўзмацненню дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія маюць дзяцей». Дапамога аказваецца да дасягнення дзецьмі шаснаццаці гадоў.

— **Пры якіх умовах выдзяляецца дапамога на дзяцей малазабяспечаным студэнцкім сем'ям?**

— У тым выпадку, калі сярэдні агульны заработак на кожнага члена сям'і складае менш чым пяцьдзесят рублёў у месяц, у адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 12 верасня 1974 года «Аб далейшым павышэнні матэрыяльнай дапамогі малазабяспечаным сем'ям, якія маюць дзяцей». Такая дапамога выплачваецца ў памеры 12 рублёў у месяц на кожнае дзіця да дасягнення ім васьмігадовага ўзросту.

**Інтэрв'ю правяла Р. МАРЧУК.**

# І стануць буднi святамі

**Яна падумала, перш чым адказаць на маё пытанне. Нарэшце рашуча прамовіла:**

**— Тое, цікавым ці нецікавым будзе жыццё на курсе, у групе, залежыць толькі ад нас. Прычым не ад актыву, а ад кожнага студэнта. Тым, хто спяшаецца абвінаваціць у шэрым, аднастайным жыцці актывістаў, я заўсёды раю падумаць над пытаннем: «А што зрабіў ты?»**

— ШТО ЗРАБІЎ ТЫ? — гэта пытанне, напэўна, не аднойчы задавала праforг другога курса філалагічнага факультэта Святлана Абрамішвілі, калі ёй даводзілася сутыкацца з раўнадушшам і абыякавасцю, беспрынцыповасцю і аднабаковай патрабавальнасцю. Стаж яе прафсаюзнай работы пакуль што невялікі — крыху больш за год. Але пэўны аўтарытэт на курсе ёю ўжо заваяваны.

— Сакрэтаў у гэтым няма. Патрэбна з душой адносіцца да свайго даручэння, — расказвае Святлана. — З аднакурснікамі ў мяне адносіны найлепшыя. Я вучуся ў Мінску, люблю Беларусь.

Сумаваць ёй не даводзіцца, бо спраў хоць адбаўляй: лекцыі, грамадская работа, спорт, мастацкая літаратура... Але большую частку дня яна праводзіць сярод аднакурснікаў. І ніколі не наракае на гэта, бо яе будучая работа — з дзецьмі, а ў школе навыкі арганізатарскай работы вельмі спатрэбяцца.

Праўда, гэта будзе яшчэ не хутка. А пакуль дзяўчына штурмуе навуку, думае, як зацікавіць аднакурснікаў добрай справай.

**В. ЖДАНКО.**

НЯДАЎНА НА СТАДЫЁНЕ універсітэта адбыўся злёт СБА факультэта прыкладной матэматыкі. Падрыхтоўка і правядзенне такога масавага мерапрыемства — справа для штаба працоўных спраў даволі новая. Усяго толькі другі раз сабраліся байцы будатрадаў ФПМ, каб памерацца сіламі, паказаць, на што здольныя кожны баец і атрад увогуле, бо, акрамя спартыўных спаборніцтваў, праводзіліся яшчэ і агляды-конкурсы атрадных газет, куткоў Ганаровага байца і куткоў па тэхніцы бяспекі.

## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# ЯК СПРАВЫ, СБА?

Злёт адкрыўся мітынгам больш чым паўтысячнага зводнага атрада факультэта, які ўключаў у сябе чатырнаццаць лінейных студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Намеснік дэкана М. М. Труш і сакратар камітэта камсамола Л. Панчанка цёпла павіншавалі байцоў з адкрыццём злёту, пажадалі ім поспехаў у будучай працы.

Спартыўная праграма злёту была разнастайнай. Гэта і футбольныя і валейбольныя гульні, і эстафета, і перацягванне каната, і падняцце гіры. Першае месца па валейболу заняла каманда СБА імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Найбольшага поспеху ў футбольных спаборніцтвах дабілася каманда СБА «Алгарытм». Другімі і трэцімі былі адпаведна каманды СБА імя Чэ Гевары і імя С. Альендэ.

Пакуль праходзілі спартыўныя спаборніцтвы, камісары атрадаў ацэньвалі работу атрадных рэдкалегій па афармленню нагляднай агітацыі. Цікавыя і змястоўныя газеты прадставілі атрады імя А. С. Макаранкі, «Ветразь-83», «Беларусачка», якія і перамаглі ў гэтым конкурсе.

...Хутка ляцеў час. Прыйшла пара падводзіць вынікі гэтага насычанага, разнастайнага дня, які стаў сапраўдным святам будатрадаўцаў. Па суме набраных балаў лепшым сярод мужчынскіх атрадаў быў названы СБА «Алгарытм» (камандзір А. Буланы, камісар С. Бабіна). Цяпер ён будзе абараняць гонар зводнага СБА факультэта на злёце СБА БДУ імя У. І. Леніна. Нечаканым было тое, што другім стаў атрад імя Чэ Гевары (камандзір М. Дзямеш, камісар Л. Гудойцаў). Гэты СБА яшчэ вельмі малады, існуе ўсяго два месяцы, але ўжо ўпэўнена заявіў аб сабе. Лепшымі сярод жаночых атрадаў сталі «Беларусачка» (першае), «Ветразь-83» і імя А. С. Макаранкі (адпаведна другое і трэцяе месцы).

Скончылася свята. Адным яно прынесла задавальненне, другім — горыч няўдачы. Спаборніцтвы ёсць спаборніцтвы.

Але няхай прайграўшыя не засмучаюцца: галоўнай задачай злёту было высветліць, у якой ступені гатовы нашы атрады да летняга працоўнага семестра. Час выправіць недахопы яшчэ ёсць, а наперадзе — будоўлі Карэліі, Алтая, Беларусі, палі Малдавіі і Стаўрапольскага краю.

**У. КЛЮЕЎ,**
**начальнік штаба працоўных спраў ФПМ.**

# МАЯ СЯБРОЎКА НУРЫ



У 1981 годзе Галгатай Нуры прыехала ў Савецкі Саюз. У мінулым годзе яна вучылася на падрыхтоўчым факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Зараз яна — студэнтка факультэта журналістыкі. Галгатай добра вучыцца, займаецца грамадскай работай, удзельнічае ў мастацкай самадзейнасці. Першы семестр мая сяброўка закончыла на «добра» і «выдатна».

Поспехаў табе, Галгатай!

**ГІТА ШРЭСТХІ (Непал),**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**
Фота **аўтара.**

## ● АМАЛЬ АСАБІСТАЕ

# ІМГНЕННІ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ

Мы часам забываем, што некалі і выкладчыкі былі студэнтамі. Гэта часцей за ўсё здараецца на экзаменах.

***

За два гады вучобы амаль кожны дзень наведваю бібліятэку, бо яна — другі мой універсітэт.

***

Хто не служыў у арміі — той не мужчына, кажуць у народзе. А што сказаць пра тых, хто не быў студэнтам?..

***

Як хутка ляцяць лекцыі, калі побач сядзіш ты.

***

Захварэў. Ляжу адзін у ложку ў інтэрнацкім пакоі і думаю: што там новага на факультэце? Прыходзяць аднакурснікі і ўсё расказваюць, што было. Хто зможа паверыць, што я сёння адсутнічаў на занятках?..

***

Часам слухаеш лекцыю, і хочацца спаць. Лекцыі падобны на калыханку, а бывае, што і студэнты — як дзеці.

***

Студэнцкі білет — ЁН, заліковая кніжка—ЯНА. Колькі ў іх было ўжо сярэбраных і залатых вяселляў.

***

Аднакурснік прысвяціў верш дзяўчыне. Там ёсць такія радкі:

За адну тваю прыгожую
ўсмешку
Я ўсю сваю стыпендыю
аддам.

Дзівак-чалавек. Яна мне так сёння прыгожа ўсміхалася!

***

Прыйшоў з табою ў бібліятэку чытаць неабходную літаратуру, але ўвесь час думаю пра цябе і чытаю твае думкі. Гэта ж таксама неабходна.

***

Прыйшло адразу сем пісем. Адно з іх ад матулі, якое яшчэ не чакаў, але чытаю яго першым.

***

Выкладчык фізкультуры крыўдзіцца, што мы занялі апошняе месца па лёгкай атлетыцы. Каб супакоіць яго, кажу, што не апошняе месца занялі, а першае — перад тымі, хто не ўдзельнічаў у кросе. А гэта таксама перамога.

**С. ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака.**

## НАША ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

# АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЗЛАЧЫНСТВА

**Пад рэдакцыяй прафесара І. С. ЦІШКЕВІЧА**

ЗЛАЧЫНСТВА — гэта замах на сацыялістычны правапарадак, грамадска небяспечнае дзеянне, якое караецца законам. Шмат злачынстваў учыняецца ў стане ап'янення. Пад уздзеяннем алкаголю ўчыняецца большасць наўмысных забойстваў. Часта п'яныя забіваюць сваіх блізкіх, прычым з асаблівай жорсткасцю і па нязначнай прычыне. Нярэдка ў судовай практыцы бываюць выпадкі аграблення і разбою з мэтай набыцця сродкаў на спіртныя напіткі.

Згодна з законам асоба, якая здзейсніла злачынства ў стане ап'янення, не вызваляецца ад крымінальнай адказнасці. Такія асобы з'яўляюцца для грамадства найбольш небяспечнымі, бо ў нецвярозым стане ўчыняюцца найбольш цяжкія злачынствы. Згодна з артыкулам 38 КК БССР стан ап'янення ў момант здзяйснення злачынства прызнаецца абставінай, якая робіць віну больш цяжкай. Гэта цягне за сабой павышаную адказнасць.

Асобам, якія прызнаны алкаголікамі, разам з пакараннем назначаецца і прымусовае лячэнне ад алкагалізму.

П'янства, алкагалізм перашкаджаюць барацьбе са злачыннасцю. Таму неабходна весці шырокую антыалкагольную прапаганду сярод насельніцтва.

**Г. КУЛАГА,**
**студэнтка юрыдычнага факультэта.**



Казачны востраў...

Фотаэцюд С. Плыткевіча.

**Сёлета спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння Мікалая ЗАБАЛОЦКАГА [1903—1958]. Паэт думкі, паэт філасофскіх разваг і класічнай шліфоўкі верша — такім увайшоў М. Забалоцкі ў савецкую паэзію. Сёння мы прапануем увазе чытачоў некалькі твораў паэта ў перакладзе студэнта філалагічнага факультэта Уладзіміра СІЎЧЫКАВА.**

**М. ЗАБАЛОЦКІ**

## ПАРТРЭТ

Любіце жывапіс, паэты!
Бо ён, адзіны, пакрысе
Душы няўстойлівай
прыкметы
На палатно перанясе.

Ты памятаеш, як са змроку,
Захутаная ў атлас,
З партрэта Рокатава зноўку
Глядзела Струйская на нас.

А вочы—быццам два
туманы,
Напаўусмешка, напаўплач,
Яны—нібыта два падманы,
Пакрытых цемраю няўдач.

Яны—з'яднанне дзвюх
загадак,
Паўзахапленне, перапуд,
Шалёнай любасці прыпадак
І прадугадванне пакут.

Калі цячэ духмянасць ночы
І навальніца над зямлёй,
Яе цудоўнейшыя вочы
Праменяць з дна душы маёй.

## СТАРАЯ КАЗКА

Тут, у свеце, дзе наша асоба
Грае ролю няпэўна парой,
Састарэем з табою абодва,
Як састарыўся ў казцы
кароль.

А жыццё дагарае цярпліва
На мяжы запаветных краін,
Мы чакаем трывала,
маўкліва
Непазбежную долю —
спачын.

Ды калі серабрыстыя пасмы
Заблішчаць па-над скроняй
тваёй,
Разарву свае сшыткі
заўчасна,
Верш апошні пакіну зарой.

Хай душа, быццам возера,
плешча
Ля парога падземных варот,
І барвовае лісце трапеча,
Не кранаючы роўнядзі вод.

## АДЗІНОКІ ДУБ

Благая глеба: надта
вузлаваты
Самотны дуб. Яго галін узор
Нязграбны, з нейкага
атрэп'я ўбор
Вісіць на ім і шамаціць
зацята.

Ды скручаныя намертва
суставы
Ён так развіў, здаецца,
толькі ўдар—
І заспявае звонам гучнай
славы
І са ствала закапае янтар.

Уважліва зірні: стаіць
спакоен
Сярод сваіх змярцвелых ніў,
раўнін.
Хто кажа, што ў полі ён не
воін?
Ён воін, воін, нават і адзін.



# СЛОВА ПРА ФУТБОЛ

УНІВЕРСІТЭЦКІ СТАДЫЁН у гэтыя цёплыя вясеннія дні знаходзіцца пад уладай футбалістаў. Адразу тры чэмпіянаты праходзілі тут: першынство універсітэта паміж факультэтамі, інтэрнатамі і гульні першынства ВНУ БССР. Дадайце да гэтага яшчэ і шматлікія гульні на міні-пляцоўках, дзе збіраецца па некалькі соцень студэнтаў-футбалістаў. Адным словам, футбол на сённяшні дзень—самы масавы і папулярны від спорту.

Гульні па футболу праходзілі яшчэ на заснежаных пляцоўках, у залах. На працягу навучальнага года на многіх факультэтах прайшлі свае чэмпіянаты паміж курсамі. Але галоўныя спаборніцтвы года — гэта першынство паміж факультэтамі. Трэба адзначыць, што тэрміны правядзення гэтых спаборніцтваў выбраны ўдала. Што ж паказала першынство? Галоўнае, на мой погляд, тое, што універсітэцкі футбол зрабіў яшчэ адзін крок наперад. Павысіліся арганізаванасць гульні і (не пабаюся гэтага слова) майстэрства футбалістаў. Мяркуйце самі, універсітэцкая зборная ў першынстве ВНУ ідзе без паражэнняў. А 11—19 мая адбудзецца фінал гэтых спаборніцтваў.

Чэмпіёнам універсітэта другі год запар стала каманда фізічнага факультэта. Дружны, зладжаны калектыў. У каманды фізфака асаблівых цяжкасцей не было на шляху да першага месца. Ядро каманды склалі члены зборнай універсітэта І. Блізнюк, С. Аляксандраў, А. Глушкоў, П. Кліменка, В. Доўгі. Яны і задавалі тон у гульні. Бадай, лепшая сустрэча фізфака была з камандай факультэта радыёфізікі і электронікі. Лік 2:0 на карысць фізфака гаворыць сам за сябе. У добрай арганізацыі гульні вялікая заслуга Ігара Блізнюка, дыспетчара каманды (дарэчы, ён з'яўляецца капітанам зборнай універсітэта). Аднак у многіх выпадках фізікі будавалі атаку толькі праз хуткага і тэхнічнага С. Аляксандрава.

Калектыўнасць, самааддана сць вызначалі і каманду факультэта прыкладной матэматыкі. Ужо тры гады, як ФПМ страціў чэмпіёнскі тытул, мяняўся і састаў каманды. Але традыцыі засталіся. Па-ранейшаму дзякуючы ўдалай калектыўнай гульні студэнты дабіліся другога выніку на першынстве. Сярод ігракоў каманды трэба адзначыць С. Гняўко, аспіранта факультэта, члена зборнай універсітэта.

І каманда фізічнага факультэта, і ФПМ — пастаянныя канкурэнты ў барацьбе за чэмпіёнскі тытул. Сёлета дастойную канкурэнцыю ім змаглі саставіць толькі студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі. І хоць гульні з чэмпіёнам і «сярэбраным» прызёрам радыёфізікі прайгралі, каманда паказвала наступальны футбол. Як адзначыў галоўны суддзя турніра Віталь Данілавіч Ліштван, радыёфізікі ў будучым — рэальныя прэтэндэнты на званне чэмпіёнаў. Касцяк каманды складаюць члены зборнай БДУ К. Еўдакімаў, С. Васільеў, У. Казлоў.

Як дабіліся такога поспеху радыёфізікі? Чытач, напэўна, памятае, што ў мінулым годзе гэты факультэт выступаў у другой, ніжэйшай па класу групе. І ўжо тады была бачна сіла каманды, яе «скарасны» футбол. Каманда мацнее з кожнай гульнёй. Зала, якая ёсць у радыёфізікаў для трэніровак, і побач з інтэрнатам стадыён, безумоўна, павінны быць выкарыстаны максімальна.

У гэтым годзе ў першай групе дэбютант — каманда філалагічнага факультэта. Ці здолеюць філолагі, як радыёфізікі, трапіць у прызёры, пакуль што невядома. Ды і не на гэта цяпер мы павінны звяртаць увагу. Філолагі паспяхова выступілі ў групе, выйгралі па пенальці пераходную гульню ў геафака. Асобныя матчы філолагаў даюць падставу адкінуць усе размовы наконт выпадковасці іх перамог.

Год назад газета «Беларускі універсітэт» пісала, што каманда геафака страціла свой стыль гульні, набыты за многія гады. І вось вынік: на наступны год давядзецца географам выступаць у другой групе. Адна з прычын такога спаду—дрэнная калектыўная гульня, нядобрасумленнасць некаторых ігракоў.

Горшая па зместу гульня, чым у мінулы год, была характэрна для юрфака і мехмата. Юрыдычнаму факультэту (у мінулым годзе ў яго было другое месца) толькі перамога ў апошнім туры над фізфакам дала магчымасць заняць чацвёртае месца.

Яшчэ адна нечаканасць — апошняе месца журфака, чэмпіёна універсітэта 1981 года. Журналісты нацэльваліся на перамогу і вяртанне ў першую групу. Але здарылася наадварот. Футбол на факультэце перажывае не лепшыя свае часы. Паражэнне ад біёлагаў выбіла з каляіны каманду. Да таго ж, толькі на гульню з хімфакам журналісты змаглі выставіць свой асноўны састаў.

Шмат нявырашаных праблем у гістфака, біяфака. Гульня іх патрабуе большай выразнасці.

Першынство закончылася. Трэба адзначыць добрую яго арганізацыю. Аднак праблемы ва універсітэцкага футбола ёсць. Недастаткова яшчэ арганізаваны спаборніцтвы на факультэтах. Зноў, як і ў мінулым годзе, назіраецца пасіўнасць студсаветаў інтэрнатаў № 1 і № 8 у правядзенні першынства. Хочацца таксама спадзявацца, што ў практыку работы спортбюро трывала ўвойдзе арганізацыя і правядзенне таварыскіх гульняў паміж факультэтамі, курсамі, паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі.

**І. ПАПКО.**

# ЦЕРАЗ ПЕНЬ-КАЛОДУ

УЖО НЕ ПЕРШЫ год пасля першынства універсітэта па шашках і шахматах застаецца незадаволенасць арганізацыяй і судзействам турніраў. Толькі што закончылі свае партыі шахматысты. Праўда, шахмат і гадзіннікаў хапала. А вось суддзі...

Спачатку судзейскае пасяджэнне з прадстаўнікамі каманд правёў выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту У. Рэйзін. Ён назваў прозвішча галоўнага суддзі — В. Крылова, супрацоўніка фізфака. А потым У. Рэйзіна накіравалі на факультэт павышэння кваліфікацыі. В. Крылоў у выніку сваёй занятасці не змог прысутнічаць на ўсіх сустрэчах. І тут пачалося... Ролю суддзі браў на сябе кожны, хто не ленаваўся. Турнірную табліцу вывесілі толькі перад апошнім турам паўфінала. Не вызначаны канкрэтныя дні, у якія павінны былі праводзіцца матчы. Калі пісаць няяўку: у час пачатку гульні ці праз пятнаццаць хвілін, як у шашках? У палажэнні аб правядзенні спартакіяды гаворыцца, што запасны састаў каманд у шахматах не абмежаваны. Але сёлета запасных чамусьці павінна было быць толькі тры-чатыры чалавекі. Ці не зашмат няўвязак?

Была выкарыстана новая форма правядзення спаборніцтваў. Каманды разбілі на дзве падгрупы, і двое лепшых з кожнай падгрупы змагаліся потым у фінале за перамогу. Першая падгрупа, дзе выдзеліліся ФПМ і мехмат, аказалася значна слабейшай, чым другая, у якой усе чатыры каманды маглі прэтэндаваць на выхад у фінал.

У фінале паміж сабой сустрэліся каманды ФПМ, мехмата, фізфака, факультэта радыёфізікі і электронікі. Набраўшы 13,5 ачка, першае месца заняў механіка-матэматычны факультэт, на другім месцы з дзесяццю ачкамі фізічны, 9,5 ачка ў ФПМ, 9—у факультэта радыёфізікі і электронікі. У матчы за пятае—шостае месцы біяфак з мінімальнай перавагай перамог юрфак, а за сёмае — восьмае хімфак атрымаў верх над журфакам. Некалькі слоў патрэбна сказаць пра каманду гістарычнага факультэта. Прайграўшы першыя матчы з буйным лікам, гісторыкі апусцілі рукі, і іх на турніры не бачылі. Адмовіліся ўдзельнічаць у першынстве філфак і геафак.

**В. АНДРЫЕВІЧ.**

**Прыводзім табліцу ходу спартакіяды**

**Супраць факультэтаў стаяць ачкі, якія ідуць у залік спартакіяды: х-к — хакей, б-в — барацьба вольная, п-л — плаванне, ф-б—футбол, к-с — крос, ш-м — шахматы.**

| | х-к | б-в | п-л | ф-б | к-с | ш-м |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Юрфак | 180 | 136 | 178 | 90 | 155 | 70 |
| Мехмат | 80 | — | 132 | 80 | 100 | 180 |
| ФПМ | 120 | — | 190 | 150 | 110 | 120 |
| Фізфак | 90 | 147 | 338 | 180 | 40 | 150 |
| Гістфак | — | 65 | 28 | 40 | 80 | — |
| Радыёфізікі і электронікі | 60 | 29 | 200 | 120 | 180 | 90 |
| Журфак | 50 | — | — | 30 | 140 | 50 |
| Геафак | 70 | 109 | — | 70 | 90 | — |
| Хімфак | 150 | 131 | 4 | 50 | 50 | 60 |
| Біяфак | — | 27 | 33 | 60 | 70 | 80 |
| Філфак | — | — | 28 | 70 | 60 | — |



**НА ЗДЫМКУ: удзельнікі гарадской эстафеты — студэнты БДУ імя У. І. Леніна.** Фота В. ГРАМОВІЧА.

# ЗНОЎ СПРЭЧКІ

ВЯСНА, ЯК І ВОСЕНЬ,—пара лёгкаатлетычных кросаў. Гэтыя спаборніцтвы — адны з самых масавых ва універсітэце. І нядаўна ў фінале універсітэцкага кросу ўдзельнічала каля 600 чалавек. Фінал выліўся ў свята.

І ўсё ж яно было крыху сапсавана. Сапсавана арганізатарамі. Відаць, яны хацелі, каб больш спартсменаў выканалі разрадныя нарматывы, і таму скарацілі дыстанцыю. Было паказана шмат добрых рэзультатаў, што адбілася на выніках агульнакаманднай барацьбы. Справа ў тым, што дыстанцыі скарацілі неадпаведна. У выніку хлопцы набіралі больш ачкоў, чым дзяўчаты.

Журфак, ФПМ, мехмат аказаліся ў пройгрышы, бо ў іх саставе было больш дзяўчат. Мехмат, напрыклад, лічыцца самым «бягучым» факультэтам, але яму давялося заняць толькі пятае месца. Факультэт радыёфізікі і электронікі выставіў амаль усіх хлопцаў. Яны набралі ў сярэднім па 112 ачкоў і абагналі мінулагодняга пераможцу — юрфак—на дзесяць ачкоў. У мінулым годзе, калі спаборніцтвы праводзіліся на стадыёне, сярэдні вынік першай каманды склаў толькі 95 ачкоў. Трэцім прызёрам другі раз запар стаў калектыў журфака.

Не будзем ставіць пад сумненне поспех факультэта радыёфізікі і электронікі. Студэнты перамаглі заслужана. Думаецца, што і пры ранейшых умовах факультэт прэтэндаваў бы на першае месца. А вось прызёры маглі б тады памяняцца. Юрфак наўрад ці ўтрымаўся б другім. Тут павысіліся б шансы мехмата, ФПМ і журфака.

Толькі пяць каманд прэтэндавалі на прызавыя месцы. А дзе астатнія? У філалагічнага, фізічнага, хімічнага, гістарычнага факультэтаў былі няяўкі, прычым масавыя. Часта можна было назіраць карціну, калі бегуны пераадольвалі дыстанцыю подбегам. Які ж тут будзе рэзультат? Варта іх паводзіны разабраць на факультэце. Бо гэта неахайныя адносіны не толькі да сябе, але і да ўсяго факультэта.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПВ.
5 мая 1983 г.
Зак. 864 АТ 00094

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ